– *милые бранятся, только тешатся;*
– *в счастливом браке муж и жена живут в согласии;*
– *любимой женщине прощается даже измена, нелюбимой же не прощается и пересоленный суп.*

В русско-белорусском сознании отсутствует резко негативная оценка неизбежно возникающих в браке разногласий.

На примере пословиц и поговорок на русском, белорусском и английском языках были выявлены сходства и различия в отношении к семейным ценностям, быту и во взаимоотношениях между супругами. Данное исследование помогло увидеть, что понятие «брак», несомненно, является значимым в кругу ценностных ориентиров, которые отражаются в культурах русского, белорусского и английского народов и их языках.

**Литература**

1 Лихачев, Д. С. Концептосфера русского языка / Д. С. Лихачев // Известия Российской Академии наук, 1993. – № 1. – С. 3 – 9.

2 Кубрякова, Е. С. Краткий словарь когнитивных терминов / Е. С. Кубрякова, В. З. Демьянова, Ю. Г. Панкрац, Л. Г. Лузина. – М.: Изд-во МГУ, 1996. – 245 с.

**УДК 821.161.3 – 311.6*В. Іпатава**

***М. І. Кірушкіна***

## СПОСАБЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ МІНУЛАГА Ў ГІСТАРЫЧНЫМ РАМАННЫМ ЦЫКЛЕ В. ІПАТАВАЙ «АЛЬГЕРДАВА ДЗІДА»

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці рэалізацыі гістарычнага жанру ў раманнай форме. Мэта даследавання – выявіць спецыфіку рэпрэзентацыі падзей мінулага ў цыкле раманаў В. Іпатавай «Альгердава дзіда», што характарызуецца адметнымі спосабамі мастацкай рэканструкцыі «сітуацый» гісторыі, асэнсаваннем канкрэтна-гістарычных і міфалагічных рэалій. Вынікі: гістарычныя раманы пісьменніцы валодаюць высокім мастацкім узроўнем і асаблівасцямі паэтыкі інтэлектуальнага рамана. Творчасць В. Іпатавай практычна не даследуецца сучасным літаратуразнаўствам.*

На сучасным этапе для вызначэння новых арыенціраў у літаратурным працэсе актуальнымі з'яўляюцца даследаванні прозы ў гістарычным жанры. У адпаведнасці са зменай культурных парадыгм часу існуюць адметныя спосабы рэалізацыі ў мастацкай прозе асаблівасцей гэтай разнавіднасці эпасу, якія дазваляюць у разгорнутай аб'ектыўна-эпічнай форме раскрыць маральна-этычны і філасофскі сэнс гісторыі з пазіцыі сучаснасці. B. Baran [1], польскі даследчык літаратуразнаўства, адзначае, што такія заканамернасці звязаны з існаваннем у сучаснай культурна-сацыяльнай свядомасці XXI ст. паняцця «Новы Гістарызм», якое канструюецца ў мастацкай літаратуры пасродкам наступных мастацка-эстэтычных і структурна-ўтваральных прымет:

- усе мастацкія тэксты з элементамі паэтыкі гістарызму з'яўляюцца раўнапраўнымі «дакументамі» адпаведных эпох;
- літаратурны твор у «новагістарычным» жанры фундаментальна сплецены з рознымі дыскурсамі: інтэрпрэтацыя гісторыі адбываецца праз сучасныя культурна-гістарычныя рэаліі і «дыялог» чытача з аўтарам;
- у фабуле тэксту – філасофскія канцэпцыі і псіхааналіз, значная роля надаецца ўспамінам герояў і катэгорыі сну;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- важнай структурнай адзнакай твора такога канцэптуальнага плана з’яўляецца пераасэнсаванне і дэканструкцыя міфалагічных элементаў.

Гісторыя як эстэтычная катэгорыя анталагічнага зместу канцэптуальна даследуецца творцамі ў раманнай форме, найперш, праз канструктыўнае вызначэнне структурна-тэматычных і вобразна-эмацыянальных кампанентаў, якія задзейнічаны ў стварэнні фабулы і асноўнага канцэпта мастацкага твора ў вышэй названым жанры. У прасторавай сістэме новых жанравых адкрыццяў сучасныя беларускія творцы грунтоўна пераасэнсоўваюць эпічнае поле мінуўшчыны і па-мастацку дакладна перадаюць пакутлівы лёс народа, выкарыстоўваючы разнастайныя прыёмы сюжэтна-кампазіцыйнай арганізацыі і вобразна-стылёвага афармлення твора.

Сінтэз гістарычнай праўды з элементамі домыслу, наяўнасць прататыпных вобразаў, спецыфічныя асаблівасці ў рэканструкцыі гістарычных падзей, паказ дзейнасці нацыянальных герояў, інтэрпрэтацыя міфаў і анірычных элементаў вызначаюць мастацкую манеру В. Іпатавай пры рэпрэзентацыі мінулага ў гістарычным раманным цыкле (што мае назву апошняга з раманаў): «Залатая жрыца Ашвінаў», «Вяшчун Гедзіміна», «Альгердава дзіда». Пісьменніца падае ў гістарычных творах суб’ектыўна-аўтарскую канцэпцыю ўніверсуму герояў беларускай гісторыі пасродкам паэтызацыі асабістага разумення панарамнай даўніны, характару персанажаў, паказу дзейнасці асобы перад асэнсаваннем усёй глыбіні ўзаемадачыненняў з навакольным светам.

Адлюстраванне пэўнай падзеі, увасобленай гістарычнай «сітуацыі» ў тэксце можна разгледзець як «мадэль», якая ўключае розныя сюжэтныя рэалізацыі аўтарскай думкі пры інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў у адпаведнасці з творчым вымыслам. У творчай прасторы В. Іпатавай найбольш вызначальнымі для выяўлення адметнасцей сюжэтнай асновы гістарычнага рамана з’яўляюцца наступныя рэканструяваныя «мадэлі» падзей мінулага:

- *даследаванне міфалагічнай мадэлі светаадчування беларусаў*: рэканструкцыя арыйскіх вытокаў у гісторыі славян у рамане «Залатая жрыца Ашвінаў». Аўтар звяртаецца да перыяду стварэння беларуска-літоўскай дзяржаўнасці (XIII ст.), калі новагародская зямля была цэнтрам барацьбы, якая вялася паміж прыхільнікамі хрысціянства і язычніцтва, а ўплыў апошняга ішоў ад вераванняў арыйцаў – індаеўрапейцаў, якія прыйшлі ў II тыс. да н. э. у Індыю і Іран. Архаічная культура і рэлігійныя тэксты (Веды і Авеста) старажытных арыяў сталі асноўнай крыніцай для разгляду міфалагічных уяўленняў беларусаў у рамане. В. Іпатава зазірнула ў глыбіні нацыянальнай гісторыі, у арыйскія вытокі еўрапейскай цывілізацыі.

У цэнтры мастацкага твора – міф пра боскіх блізнятаў Ашвінаў, якія сімвалізавалі жыццё і смерць, святло і цемру, увасаблялі ранішні і вячэрні змрок, лічыліся божымі лекарамі-выратавальнікамі. Міф – гэта цэласнае і лагічна не разгорнутае ўспрыманне свету, у якім любая з’ява тоесная сабе самой і адначасова раўназначная ўсяму, што знаходзіцца па-за яе межамі; гэта асаблівы стан усведамлення, гістарычна і культурна абумоўлены. У рамане паводле тыпалогіі мастацкага міфалагізму М. Эпштэйна [2] узнаўляюцца фальклорныя і этнічна самабытныя пласты нацыянальнага быцця і свядомасці, дзе яшчэ заўважаюцца элементы светасузірання. Сляды індаеўрапейскага культу аўтар заўважае ў архітэктуры продкаў беларусаў, калі апісвае сцэну набажэнства, дзе галоўная гераіня, Жывена, упершыню спрабуе свае лекарскія здольнасці: «Высокі драўляны храм, дзе апорныя слупы, зробленыя з костак ахвярных коней, упрыгожаны драўлянай разьбой, а на даху горда глядзяць на поўнач і поўдзень дзве вялікія конскія галавы» [3, с. 19].

Вобраз свету, які блізкі да ўяўленняў продкаў беларусаў, прадстаўлены ў Авесце – самай вялікай кнізе арыйцаў, якая нясе ў сабе дуалістычны светапогляд, бо мае дзве часткі: міфалагічную – Яшты і філасофскую – Гаты, стварэнне якой прыпісваецца Заратустру, у цэнтры вучэння якога – барацьба паміж дзвюма антаганістычнымі сіламі –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дабром і Ліхам. Рэлігійная канцэпцыя «філосафа» заснавана на адмаўленні політэізму ў старажытных арыйцаў і на прызнанні монатэістычнасці веравучэння. Прарок верыў у існаванне толькі адзінага Усявышняга Бога, але ў яго рэлігіі заўважнымі былі і прыкметы язычніцтва, якія і ўзнавіла пісьменніца ў творы.

- *увасабленне анірычных форм як сродку інтэрпрэтацыі падзей мінулых эпох*: асноўныя гістарычныя «сітуацыі» (XIV ст.) рэалізуюцца В. Іпатавай у рамане «Вяшчун Гедзіміна» праз сны і мроі княжацкага вешчуна Ляздзейкі – «служкі таямнічага, які змушаны чуйна слухаць навакольнае і лавіць знакі боствау паўсюдна і заўсёды» [4, с. 77]. Сон – гэта адна са сфер духоўнага жыцця асобы, а правільная яго інтэрпрэтацыя дазваляе растлумачыць розныя прадказанні і аналітычныя сэнсы. У творы паганскі аракул абраны язычніцкімі багамі ўспрымаць і трактаваць складанасці ўніверсуму. Сны персанажа маюць значную ролю ў суб'ектыўнай арганізацыі мастацкага тэксту і ў фарміраванні сюжэтных ліній. Анірычныя элементы ў рамане ўвасоблены праз апісанне пэўных псіхаэмацыйных станаў душы галоўнага жраца Гедзіміна, якія залежаць ад раўнавагі яго свядомасці і неўсвядомленага: «Галоўнае адно – каб кожны, каго выкідае ў свет валадаром, разумеў, што гэты дар яму даецца. Але разумеючы ўсё гэта, ты, Ляздзейка, усё роўна няшчасны» [5, с. 43].

Уяўленні і сны-мроі героя-язычніка, якія складаюцца з трансцэндэнтальных пасылаў яго несвядомага, або прыроднага, пачатку, маюць у рамане наступныя зместавыя матывацыі:

- эстэтыка-філасофскі каментар жыцця, асэнсаванне асабістай свядомасці. Фундаментальнай асновай развіцця падзейнасці ў творы з'яўляюцца перажыванні, развагі Ляздзейкі, пасродкам якіх В. Іпатава мадэлюе маральна-тэматычную спецыфіку рамана: «Ды, урэшце, жыццё наша – хіба не сон, дзе цяжка бывае разабрацца: ці то ты сніш жыццё, ці само яно сніць цябе?» [4, с. 114];

- футурыстычнае прадбачанне лёсу асобы і дзяржавы: на аснове трансфармацыі сваіх сноў жрэц прадказвае вызначальныя падзеі для княства. Мадыфікаванай «сітуацыяй» у рамане выступае сон Ляздзейкі аб заснаванні новай сталіцы княства – Вільні, таму што, як вядома з гістарычных крыніц, сон аб гэтай падзеі прысніўся Гедзіміну. Тлумачэнне звяздаром сімвалічнага пасылу неўсвядомленага для гісторыі аказалася прарочай: «Гэта значыць, што там павінен быць горад <…>. Твая сталіца, княжа» [4, с. 98].

В. Іпатава ў рамане «Вяшчун Гедзіміна» пасродкам форм анірычнай рэальнасці, прэзентацыі дзейнасці душы / фантазіі героя, вызваленай ад магутнасці розуму, стварае сіметрычныя для беларускай гісторыі асобныя сюжэтныя карціны. Сутнасць сноў і трызненняў Ляздзейкі – у духоўным адраджэнні праз trans (псіхічнае разбурэнне) і ў стварэнні аўтарам адметнай для трансфармацыі вынікаў сінкрэтычнай somnus-прасторы тэксту: анірычныя формы валодаюць зместам толькі пры ўпарадкаванні хаатычнага свету персанажа (індывідуума), што дасягаецца за кошт самааналізу.

- *прэзентацыя гістарычных «сітуацый» паводле ролі і дзейнасці ў мастацкім тэксце персанажа (героя) высокага міметычнага модуса*. У такім выпадку герой паводле сваёй эстэтычна-развіццёвай дзейнасці валодае магчымасцю «ілюстраваць» падзейнасць твора, з'яўляецца яго адзінствам. У рамане «Альгердава дзіда» механізм ілюстрацыі падзей беларускай гісторыі, паводле творчай задумы аўтара, падпарадкаваны паводзінам, зменам душэўнага стану славутага для беларускай гісторыі князя Альгерда, яго ўдзелу ў сюжэтным руху рамана. Ён надзелены ўладай, гарачынёй і моцай, бо «ведаў – княжычу нельга паддавацца пачуццям, яму ў будучыні належыць рупіцца за іншых, адказваць за іх» [6, с. 28]. Вобраз персанажа дэталізаваны, характэрным яго атрыбутам з'яўляецца дзіда, якая ў культурнай традыцыі сімвалізуе мужчынскі пачатак і моц зямлі. Такім чынам, герой В. Іпатавай, які выступае ўтваральным звяном падзейнасці ў рамане, з'яўляецца выразнікам волі народу, мае высокае сацыяльнае паходжанне, моцны валявы характар, у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аснове якога такія якасці, як смеласць, подзвігі і высакароднасць жыццёвай мэты – rem verba sequentur, што азначае: за словам справа.

Адзінства героя і мастацкага тэксту – гэта сістэма, якая мае свае арганізацыйныя дамінанты. У рамане «Альгердава дзіда» імі з’яўляюцца наступныя пазнавальна-сюжэтныя «сітуацыі»:

- суіснаванне ў тэксце хрысціянства і язычніцтва, што звязана з жыццёвай стратэгіяй Альгерда: «<…> ён не хацеў бы даваць волі над сабой нікому – ні паганскім жрацам, ні хрысціянскім святарам, аднак князю, якога не падтрымліваюць вестуны, не ўдасца валадарыць» [6, с. 79]. У маладосці яго прываблівала хараство і незвычайнасць храма Ашвінаў, а з жаніцьбай з віцебскай княгіняй усё-такі спрабаваў зразумець сутнасць рэлігіі Хрыста;

- вызначэнне ролі ВКЛ у палітычнай барацьбе за ўладу: перамога дзяржавы ў розных сутыкненнях паказваецца аўтарам менавіта праз дзейнасць князя, які «рабіўся магутным уладаром краіны, роўнай якой было мала ў Еўропе» [7, с. 92].

Пісьменніца адлюстравала ў рамане «Альгердава дзіда» важныя факты беларускай гісторыі, рэпрэзентацыя якіх у тэксце падпарадкавана пераломным у лёсе канкрэтнай гістарычнай асобы перыядам.

Гістарычныя раманы В. Іпатавай, такім чынам, характарызуюцца наступнымі мастацкімі адметнасцямі:

- наяўнасцю мастацкай умоўнасці, у аснове якой – сапраўдныя гістарычныя падзеі, міф з архетыпізаванымі прасторава-часавымі кампанентамі, ірацыянальная свядомасць персанажа твора, інтэрпрэтацыя філасофскіх канцэпцый вядомых прарокаў;

- адметнымі спосабамі рэканструкцыі гістарычных падзей і стварэннем праўдзівых сюжэтаў, што рэалізуецца аўтарам у розных «мадэлях» Гісторыі;

- суб’ектыўна-аўтарскім даследаваннем сувязей паміж мінулым і сучаснасцю, на перыферыі якіх – вядомыя гістарычныя асобы, высокія маральныя традыцыі, важкія рэаліі мінуўшчыны;

- увасабленнем аўтарскай канцэпцыі асобы пры ілюстрацыі гістарычных падзей у мастацкім творы.

Творы з раманнага цыкла «Альгердава дзіда» валодаюць высокім мастацкім узроўнем і асаблівасцямі паэтыкі інтэлектуальнага рамана: сінкрэтычнасцю структуры, што праяўляецца праз суіснаванне ў тэксце гісторыі, міфалагічных матываў і вобразаў, філасофскіх канцэпцый і асаблівасцей псіхааналізу. Гістарычныя раманы В. Іпатавай насычаны дакладнымі звесткамі і аргументацыямі з мінулага, дзе дзейнасць герояў падпарадкавана іх учынкам, разважанням і псіхалагічнай матывацыі, што з’яўляецца вызначальным для сюжэтнай падзейнасці.

**Літаратура**


1 Baran, B. Posty / B. Baran // Postmodernizm i kocce wieku. – Krakyw: Drukarnia Wydawnicza im. W. Anczyca SA, 2003. – Str. 112 – 155.

2 Аверинцев, С. Мифы / С. Аверинцев, М. Эпштейн // Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В. Кожевникова, П. Николаева. – Москва, 1987. – С. 222–225.

3 Іпатава, В. Залатая жрыца Ашвінаў / В. Іпатава // Полымя. – 1997. – № 10. – С. 16–110.

4 Іпатава, В. Вяшчун Гедзіміна / В. Іпатава // Маладосць. – 2000. – № 10. – С. 63–188.

5 Іпатава, В. Альгердава дзіда / В. Іпатава // Полымя. – 2001. – № 9. – С. 3–84.

6 Іпатава, В. Альгердава дзіда / В. Іпатава // Полымя. – 2001. – № 10. – С. 41–102.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ